УДК 02(091)(476)"19"+929(476)Хлябцэвіч Я. І.

*Да 130-годдзя з дня нараджэння Яўгена Хлябцэвіча*

*М. Б. ПАЖАРЫЦКІ*

# УКЛАД ЯЎГЕНА ХЛЯБЦЭВІЧА Ў БІБЛІЯТЭЧНУЮ СПРАВУ БЕЛАРУСІ

*Мэтай артыкула з'яўляецца разгляд у гістарычным аспекце бібліятэчнай дзейнасці Яўгена Хлябцэвіча. Упершыню падрабязна аналізуецца яго дасавецкая навуковая і практычная бібліятэчная праца. Асаблівая ўвага звяртаецца на арганізацыю ім і тэарэтычнае асэнсаванне бясплатных народных бібліятэк, складанне для іх рэкамендацыйнай бібліяграфіі, распрацоўку асноў канцэпцыі бібліятэчных сетак. Адзначаецца, што погляды і імкненні Я. І. Хлябцэвіча, арыентаваныя на пошук шляхоў і спосабаў забеспячэння чытацкіх патрэбнасцей масавага карыстальніка кнігазбораў, знайшлі адлюстраванне і ў яго навуковых работах савецкага перыяду. Робіцца выснова, што бібліятэказнаўчыя ідэі асветніка актуальны ў цяперашні час.*

Яўген Іванавіч Хлябцэвіч – яркая постаць у гісторыі. Ён праявіў сябе ў бібліятэказнаўстве, бібліяграфіі, літаратуразнаўстве, публіцыстыцы, палі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыцы. Аднак пры вывучэнні яго шматлікіх інтарэсаў найбольш актуальным быў і застаецца недастаткова даследаваны бібліятэчны напрамак. Да таго ж іншыя кірункі дзейнасці ў пэўнай ступені таксама працавалі на бібліятэчную справу, праз якую Я. І. Хлябцэвіч рэалізоўваў свой культурна-асветніцкі патэнцыял, што ў дарэвалюцыйны перыяд было непасрэдна звязана з Беларуссю, нацыянальным адраджэннем. Галоўныя прынцыпы бібліятэчнай дзейнасці Я. І. Хлябцэвіча (асветніцтва і дэмакратызм) праявіліся перш за ўсё ў стварэнні бясплатных народных бібліятэк у беларускай глыбінцы, што было запатрабавана часам.

Да вывучэння жыцця і дзейнасці Я. І. Хлябцэвіча звярталіся Р. М. Семашкевіч [9; 10], В. Е. Лявончыкаў [2], М. І. Пакала [6], В. У. Скалабан [11; 12], А. М. Пяткевіч [7; 8], М. Б. Пажарыцкі [4; 5], С. М. Чыгрын [22]. Матэрыял пра яго пададзены ў біябібліяграфічным слоўніку «Беларускія пісьменнікі» [1], энцыклапедыях [13; 15]. І ўсё ж пра Я. І. Хлябцэвіча, асоба якога заслугоўвае даследчыцкай увагі, напісана мала. Кароткія энцыклапедычныя звесткі, невялікія артыкулы, беглае згадванне ў панарамных даследаваннях.

У выніку ніводзін з этапаў бібліятэчнай дзейнасці Я. І. Хлябцэвіча не раскрыты належным чынам, амаль не звернута ўвага на яе вытокі. Мы зоймемся аналізам дарэвалюцыйнай бібліятэчнай працы Я. І. Хлябцэвіча і зробім пэўны агляд яго бібліятэчнай дзейнасці савецкага перыяду. Для рэалізацыі пастаўленых задач неабходна ўводзіць ва ўжытак першакрыніцы, многія з якіх захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, у тым ліку неапублікаваныя рукапісы Я. І. Хлябцэвіча «Янка Купала, книги и библиотеки», «Книжный и библиотечный листок при петербургской газете “Новая Русь” (1909–1910 гг.)»*, а таксама яго даклад на Першым Усерасійскім з’ездзе па бібліятэчнай справе [18], даследаванне «Возрождение белорусской народнической литературы» [17]. Як важную крыніцу варта ўлічваць і выкарыстоўваць работу Я. І. Хлябцэвіча «Библиотеки и кооперации» [19], якая захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (плануецца атрыманне лічбавай копіі для ННБ). Неабходна звярнуцца і да прац савецкай пары, у прыватнасці, манаграфіі «Массовый читатель и работа с книгой» [21], якая ёсць у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Яўген Іванавіч Хлябцэвіч нарадзіўся 6 жніўня (25 ліпеня) 1884 г. у Жыровічах. Яго бацька, Іван Андрэевіч Хлябцэвіч, загадваў бібліятэкай Жыровіцкага манастыра, дзе ўпарадкаваў старажытныя рукапісы [14]. У манастырскай бібліятэцы часта бываў падлетак Яўген. «Ён вучыўся ў бацькі, як трэба ўмець чытаць кнігу, ведаць яе» [22, с. 27], – адзначае С. М. Чыгрын. З ранняга дзяцінства Яўген Хлябцэвіч пераймаў вопыт бібліятэчнай справы. На працягу жыцця прычыніўся да стварэння бібліятэк розных тыпаў і відаў. Паспяхова збіраў асабістую бібліятэку, стаў арганізатарам

*Утрымліваюцца ў рукапісным фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, выкарыстаны аўтарам пры напісанні артыкула.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліятэкі пэўнай сацыяльнай групы (Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта), займаўся распаўсюджваннем масавых бясплатных народных бібліятэк і г.д.

Звесткі пра ўласную бібліятэку Я. І. Хлябцэвіча даволі скупыя. У лісце ад 25 верасня 1915 г. падчас Першай сусветнай вайны яго брат Уладзімір пісаў яму: «Усе сёлы гарэлі пры непрысутнасці нашых людзей. Кнігі (10 скрыняў) закапаны ў вельмі надзейным месцы. Там тваё ўсё» [16, с. 135]. Па тым часе гэта, відаць, была не малая бібліятэка. Напэўна, значную долю яе складалі творы беларускіх пісьменнікаў, што, мяркуем, дапамагло Я. І. Хлябцэвічу падрыхтаваць пра нацыянальных майстроў слова матэрыялы, многія з якіх разам з лістамі літаратараў да яго захоўваліся ў згаданых скрынях [16, с. 135]. Дадзеная асабістая бібліятэка і шэраг яго рукапісаў не знойдзены, хоць спроба зрабіць гэта здзяйснялася [22, с. 25].

Фарміраванню Я. І. Хлябцэвіча як бібліятэчнага дзеяча спрыяла спалучэнне ў яго асобе гуманітарыя і прыродазнаўца. Масавыя бібліятэкі пачатку XX ст. складаліся ў асноўным, вядома, з мастацкіх і гуманітарных кніг, але мелі ў сваіх фондах і прыродазнаўчую літаратуру. Арганізатарам бібліятэк неабходна было арыентавацца ў дастаткова шырокім спектры тагачасных навук. Я. І. Хлябцэвічу дапамагала разнапрофільнасць атрыманай ім адукацыі. У 1900 г. ён закончыў Жыровіцкае духоўнае вучылішча, у 1906 г. – Віленскую праваслаўную духоўную семінарыю. У 1907–1913 гг. з'яўляўся студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта Пецярбургскага ўніверсітэта па спецыяльнасці «біялогія» [2, с. 150].

У свядомасці, тыпе мыслення Я. І. Хлябцэвіча пераважаў, на наш погляд, гуманітарны кампанент. Таму лагічна і заканамерна ён стаў ініцыятарам стварэння і адным з найбольш актыўных удзельнікаў Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта. Члены гуртка на пасяджэннях выступалі з рэфератамі па мове, гісторыі, культуры, эканоміцы Беларусі, пытаннях айчыннай бібліятэчнай справы, запрашалі да сябе з лекцыямі на беларусазнаўчыя тэмы вядомых расійскіх вучоных. З мэтай пашырэння кругагляду і самаадукацыі ў галіне нацыянальных ведаў гурткоўцы сабралі салідную бібліятэку. Паспяховым быў зварот Я. І. Хлябцэвіча да акадэміка А. Шахматава з просьбай прадаставіць выданні Пецярбургскай Акадэміі навук, якія адносяцца да ўсебаковага навуковага вывучэння Беларусі. Акадэмік А. Шахматаў, які кіраваў Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Акадэміі навук, дазволіў перадаць згаданай бібліятэцы выданні, што мелі дачыненне да Беларусі (напрыклад, «Слоўнік беларускай мовы» І. Насовіча, манаграфію «Беларусы» Я. Карскага, працы П. Шэйна, А. Сержпутоўскага, П. Бяссонава, Е. Раманава і іншых). Гурткоўцы не толькі дбалі пра ўласны інтэлектуальны і духоўны рост, але і неслі набытыя веды, культурны запас у народныя масы. Члены Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта, і ў першую чаргу вядомы ў будучым бібліятэчны дзеяч Я. І. Хлябцэвіч, сталі ініцыятарамі стварэння ў беларускіх вёсках бясплатных народных бібліятэк. Безумоўна, хатняя бібліятэка Я. І. Хлябцэвіча была право-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бразам, мадэллю галоўнага дзецішча – народных бібліятэк, а бібліятэка гуртка, акрамя таго, верагодна, была і вядучым метадычным цэнтрам для іх.

Бясплатныя народныя бібліятэкі з'явіліся ў Беларусі ў пачатку XX ст. ва ўмовах нацыянальна-патрыятычнага ўздыму, які быў звязаны з беларускім нацыянальным адраджэннем, адменай забароны на беларускае слова ў друку, рэвалюцыяй 1905–1907 гг., што абудзіла розныя этнасы тагачаснай Расіі, у тым ліку насельніцтва Паўночна-Заходняга краю.

Па праблемах бібліятэчнай справы Я. І. Хлябцэвіч друкаваўся ў пецярбургскай газеце «Новая Русь», а ў 1909–1910 гг. пры гэтым выданні рэдагаваў уласны аўтарскі праект «Книжный и библиотечный листок», мэтай якога было прасоўванне кнігі, па магчымасці на бясплатнай аснове, у самыя аддаленыя і дробныя населеныя пункты царскай Расіі, што адлюстроўвала настрой пецярбургскай студэнцкай моладзі, прынамсі, студэнцкіх зямляцтваў Пецярбургскага ўніверсітэта. У «Листке…» Я. І. Хлябцэвіч падрабязна распавядаў пра прагрэсіўныя тэндэнцыі ў бібліятэчным руху, паўленкаўскі фонд, кнігавыдаўца Фларэнція Паўленкава, які выпусціў творы Герцана, Пісарава, Дабралюбава, Бялінскага і іншых і завяшчаў усе даходы ад выдавецтва і ўсю маёмасць выдавецтва на арганізацыю 2000 бясплатных народных бібліятэк у сельскай мясцовасці Расійскай імперыі. Я. І. Хлябцэвіч распрацаваў і апублікаваў у «Листке...» адрасаваны паўленкаўскім народным бібліятэкам рэкамендацыйны каталог, якім прадугледжвалася набыццё для кожнай з іх кніг на суму ў 100 рублёў і стварэнне 9 галіновых аддзелаў па розных дысцыплінах. Гэта быў адбор лепшых твораў рускай і замежнай мастацкай літаратуры і навукова-папулярных выданняў для масавага выкарыстання. Прапаноўвалася бібліятэкарам народных бібліятэк скласці на падставе зыходнага каталога некалькі варыянтаў спісаў кніг на адпаведныя сумы з мэтай, каб бібліятэку можна было папаўняць па ступенях, на 10, 25, 40, 75 рублёў і г.д. На старонках «Листка…» даваліся бібліяграфічныя даведкі па запытах чытачоў, арганізацыйныя і юрыдычныя парады, як адкрыць бясплатную народную бібліятэку.

У беларускім краі Я. І. Хлябцэвіч займаўся канкрэтнымі практычнымі справамі па стварэнні бібліятэк [4], што вымушала яго часта прапускаць заняткі ва ўніверсітэце, быць у ад'ездзе, наведваць родныя мясціны [10, с. 67]. Бясплатныя народныя бібліятэкі былі адкрыты і дзейнічалі ў вёсках Астрамечава Брэсцкага павета Гродзенскай губерні, Кленікі і Шчыты Бельскага павета і г.д. Як канстатуе М. І. Пакала, пры ўдзеле Я. І. Хлябцэвіча ў Беларусі «было створана 11 народных бібліятэк: дзевяць у Гродзенскай губерні і дзве ў Мінскай. Яны распаўсюджвалі літаратуру сярод жыхароў звыш 100 вёсак» [6, с. 55]. Дзякуючы гэтым бібліятэкам, як сцвярджаў Я. І. Хлябцэвіч, беларускія сяляне ўпершыню атрымалі магчымасць пазнаёміцца з творамі нацыянальных пісьменнікаў Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі, Ф. Багушэвіча і іншых, з першымі беларускімі газетамі «Наша доля», «Наша ніва».

Народную бібліятэку-чытальню ў Кленіках, адкрытую ў 1907 г., узначаліў бацька Я. І. Хлябцэвіча (у 1897 г. сям'я Хлябцэвічаў пераехала з Жыровіч у Кленікі).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аснову беларускіх бясплатных народных бібліятэк, таксама як і рускіх, склалі пакінутыя па завяшчанні кнігі і грашовыя сродкі вядомага кнігавыдаўца Фларэнція Паўленкава. Праўда, сродкаў паўленкаўскага фонду было недастаткова. Узнікала неабходнасць адшукваць дадатковыя фінансавыя рэсурсы праз сельскія таварыствы, выносіць пытанне на абмеркаванне вясковых сходаў, арганізоўваць добраахвотныя ахвяраванні, грашовыя зборы ў падтрымку народных бібліятэк. У скіраваных на фарміраванне кніжных фондаў мерапрыемствах Я. І. Хлябцэвіч заклікаў удзельнічаць як вяскоўцаў, так і гараджан. Актыўна займалася падборам літаратуры для народных бібліятэк і іх забеспячэннем дэмакратычная інтэлігенцыя Беларусі. Напрыклад, сябар Я. І. Хлябцэвіча паэт Янка Купала, які ў перыяд з 1909 г. па 1913 г. знаходзіўся ў Пецярбургу і вучыўся на агульнаадукацыйных курсах Чарняева, забяспечваў народныя бібліятэкі выданнямі беларускага выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца», што інтэнсіўна друкавала творы беларускіх класікаў, у тым ліку самога Купалы. Члены Беларускага навукова-літаратурнага гуртка Пецярбургскага ўніверсітэта клапаціліся аб атрыманні кніг ад выдавецтваў «Знание», «Посредник» і іншых, ладзілі вечарынкі і канцэрты на карысць бібліятэк. Сярод удзельнікаў гуртка была акцёрская трупа, якая ставіла (у тым ліку дзеля бібліятэк) на беларускай мове спектаклі па творах Чэхава, Ажэшкі, Купалы [3, с. 75]. У Пецярбургу не толькі ва ўніверсітэце, а і ў астатніх навучальных установах было шмат студэнтаў з Беларусі. Сярод пецярбургскага пралетарыяту таксама было нямала рабочых-беларусаў. Найбольшую цікавасць у грамадскасці выклікалі спектаклі па п’есах Я. Купалы. Так, на Пуцілаўскім заводзе вялікі рэзананс мела пастаноўка «Паўлінкі». Захаваўся фотаздымак, зроблены ў 1913 г. пасля прэм’еры камедыі, на якім разам з Купалам, акцёрамі і пастаноўшчыкамі сфатаграфаваны і Я. І. Хлябцэвіч [11, с. 141; 12], хоць ён не ўваходзіў у склад трупы. Але Я. І. Хлябцэвіч з’яўляўся ініцыятарам стварэння беларускага гуртка, стваральнікам і галоўным ідэолагам бясплатных народных бібліятэк, што было адным з ключавых напрамкаў дзейнасці гуртка. Значная частка грашовых збораў з беларускіх студэнцкіх вечарынак, канцэртаў, спектакляў ішла на набыццё літаратуры для народных бібліятэк Беларусі. Па хадайніцтве вышэйзгаданага гуртка Пецярбургская Акадэмія навук у парадку выключэння бясплатна выдзяляла беларускім народным бібліятэкам творы рускай класічнай літаратуры, пасылалі свае кнігі Л. Талстой, М. Горкі, А. Серафімовіч, арганічна тым самым дапаўнялі і падтрымлівалі мастацкія і ідэйныя дасягненні беларускіх аўтараў.

У народных бібліятэках Беларусі была багата прадстаўлена руская і замежная класіка. Фонды гэтых бібліятэк не абмяжоўваліся мастацкай літаратурай. Тут былі кнігі па розных галінах ведаў, і не толькі гуманітарных. У беларускія народныя бібліятэкі паступала прыродазнаўчая літаратура [6, с. 55]. Зразумела, яна была папулярнага характару і выкарыстоўвалася сельскай моладдзю і падлеткамі ў якасці прыступкі на шляху да ведаў, якія можна было атрымаць ва ўніверсітэцкіх цэнтрах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Я. І. Хлябцэвіч з’яўляўся членам Беларускай сацыялістычнай грамады – першай беларускай нацыянальнай партыі, якая аб’ядноўвала ў пачатку XX ст. нацыянальна свядомых студэнтаў, чыноўнікаў, пісьменнікаў і іншых прадстаўнікоў інтэлігенцыі. На з’ездах Грамады смела для таго часу ўздымалася пытанне аўтаноміі Беларусі. Па запрашэнні Цёткі Я. І. Хлябцэвіч прыняў непасрэдны ўдзел у ІІ (нелегальным) з’ездзе БСГ [1, с. 194]. Ён быў асабіста знаёмы са многімі выдатнымі дзеячамі гэтай партыі: Цёткай, К. Каганцом, А. Бурбісам і іншымі. Не выпадкова ў айчынных народных бібліятэках разам з легальнай мелася і нелегальная, забароненая цэнзурай літаратура, якая крытыкавала самадзяржаўе і садзейнічала абуджэнню грамадства. Каб адцягнуць увагу ўлад і не трапіць у небяспеку, такія выданні, паводле ўспамінаў Я. І. Хлябцэвіча, змяшчаліся ў адзін пераплёт з легальнымі, маскіраваліся пад іх.

На бібліятэчныя тэмы Я. І. Хлябцэвіч друкаваўся ў беларускіх газетах «Наша доля», «Наша ніва», іншых перыядычных выданнях: пісаў нарысы пра дасягненні і цяжкасці на шляху стварэння беларускіх народных бібліятэк, займаўся папулярызацыяй кнігі. Спіс публікацый Я. І. Хлябцэвіча ў згаданых газетах пададзены В. Е. Лявончыкавым [2, с. 156], а факсімільнае выданне асноўнай тагачаснай айчыннай газеты «Наша ніва» сёння ёсць амаль у кожнай беларускай бібліятэцы, дзе чытач можа пазнаёміцца з адпаведнымі працамі.

Істотнай падзеяй у станаўленні Я. І. Хлябцэвіча як бібліятэчнага спецыяліста варта лічыць, на наш погляд, Першы Усерасійскі з’езд па бібліятэчнай справе, што адбыўся ў 1911 г., калі ў Яўгена Іванавіча перад бібліятэчнай сферай былі ўжо немалыя заслугі, якія дазволілі, нягледзячы на малады ўзрост, уключыць яго кандыдатуру ў спіс дэлегатаў вышэйшага бібліятэчнага форуму. На з’ездзе Я. І. Хлябцэвіч выступіў з прамовай «Развитие библиотечного дела в Белоруссии», дзе сцвярджаў, што «праваднік самастойнай думкі народа – бібліятэка – адкрывае вочы на магчымасць выхаду з цяжкага становішча да лепшай долі» [18, с. 431].

Сабраны для даклада на Усерасійскім бібліятэчным з’ездзе матэрыял, а таксама абмеркаванне вынікаў з’езда на пасяджэннях Беларускага навукова-літаратурнага гуртка паслужылі асновай для напісання Я. І. Хлябцэвічам брашуры «Библиотеки и кооперации», якая была выдадзена ў Коўне ў 1912 г. і з’явілася, паводле меркавання В. Е. Лявончыкава, адной з першых прац па тэорыі і арганізацыі бібліятэчнай справы [2, с. 152]. У ёй на канкрэтных прыкладах паказваецца роля народных бібліятэк у распаўсюджванні сярод народу асветы, ведаў, выяўляюцца сувязь і ўплыў бібліятэк на развіццё пры іх кааператыўных прадпрыемстваў, таварыстваў. Яшчэ ў дакладзе на бібліятэчным з’ездзе Я. І. Хлябцэвіч паведамляў пра ўплыў такіх прадпрыемстваў і таварыстваў на фарміраванне эканамічнай свядомасці сялян, іх прадпрымальнасці, што абарочвалася ў выглядзе матэрыяльных сродкаў і на карысць бібліятэк [18, с. 431]. Да таго ж селянін, калі прыходзіў, напрыклад, у спажывецкую краму ці саматужна-прамысловую майстэрню пры народнай бібліятэцы, заадно, відавочна, наведваў бібліятэку ў якасці чытача. Атрымліваецца, такога роду кааператыўныя прадпры-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

емствы спрыялі ажыццяўленню бібліятэчных паслуг, а гэта значыць, Я. І. Хлябцэвіч стаяў ля вытокаў бібліятэчнага маркетынгу. Апрача таго, у брашуры аўтар прапануе на маркетынгавых прынцыпах стварыць для сельскага насельніцтва бібліятэчную сістэму, усе элементы якой будуць узаемазвязаны і будзе наладжана іх узаемадзеянне. Згодна з думкай Я. І. Хлябцэвіча, у кожным павеце павінна існаваць сетка земска-грамадскіх бібліятэк [19, с. 16], у складзе якой неабходна мець цэнтральную грамадскую бібліятэку ў павятовым горадзе ці іншым цэнтры аколіцы. Паводле Я. І. Хлябцэвіча, цэнтральная бібліятэка абавязана забяспечваць павышаныя інтарэсы насельніцтва ўсяго павета. У буйных пунктах павета мэтазгодна адкрыць апорныя раённыя грамадскія бібліятэкі, якія самастойна або пры дапамозе сельскіх народных бібліятэк будуць абслугоўваць чытачоў свайго раёна. Народныя грамадскія бібліятэкі павінны быць ва ўсіх, па магчымасці, вёсках павета. Для абслугоўвання дробных населеных пунктаў, якія не маюць пастаянных бібліятэк, патрабуецца стварыць, лічыў Я. І. Хлябцэвіч, перасовачныя грамадскія бібліятэкі. Такая сістэма была зручнай для адпаведных адміністрацыйных працэдур, фарміравання збалансаванага кадравага складу, раўнамернага камплектавання кніжных фондаў у межах бібліятэчнай сеткі, недапушчэння залішняга дубліравання літаратуры паміж пунктамі абслугоўвання, уліку спецыфікі чытацкіх інтарэсаў карыстальнікаў бібліятэк-філіялаў, рэгулявання іншых працэсаў. Такім чынам, навуковец стаяў ля вытокаў і бібліятэчнага кіравання.

У 1914 г. у Пецярбургу Я. І. Хлябцэвіч выдаў працу «Возрождение белорусской народнической литературы», якая ў 1917 г. была перавыдадзена пад назвай «Народническая поэзия белорусов». Дадзеная работа ў тую эпоху была, на наш погляд, добрым дапаможнікам у галіне камплектавання фондаў беларускіх бібліятэк нацыянальнай мастацкай літаратурай. Тут названа мноства імён, твораў. Даследчык прааналізаваў вытокі і характар беларускага мастацкага слова, даў ацэнку ідэйна-эстэтычным пошукам В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі, іншых творцаў, духоўная спадчына якіх народніцкая, паводле вызначэння Я. І. Хлябцэвіча. Аўтар звярнуў увагу на газету «Наша ніва», на старонках якой, па яго падліках, друкаваліся вершы 61 паэта, адзначыў эфектыўную працу выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» і г.д. Сваёй навуковай і практычнай дзейнасцю Я. І. Хлябцэвіч імкнуўся несці народніцкую літаратуру ў масы. Ён разумеў, што працэсы інтэнсіфікацыі стварэння і выдання твораў народніцкай літаратуры, а таксама дэмакратызацыі бібліятэчнай справы ўзаемазвязаны і ўносяць важкі ўклад у фарміраванне нацыянальнай свядомасці, пошук беларускай ідэі.

Арганізацыя народных бібліятэк у Беларусі была перапынена Першай сусветнай вайной. У 1914–1917 гг. Я. І. Хлябцэвіч служыў у войску, быў на фронце. У 1918 г. стаў інструктарам Беларускага пададдзела аддзела асветы нацыянальных меншасцей Народнага камісарыята асветы РСФСР у Кіеве. У 1919 г. пераехаў у Маскву, дзе ўзначаліў бібліятэчнае аддзяленне Палітычнага ўпраўлення Рэўваенсавета РСФСР. Аднак ва ўмовах новай рэчаіснасці яму, відаць, няпроста было займацца бібліятэчнай справай.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нагадаем, што ў маладосці Я. І. Хлябцэвіч вучыўся на святара, а яго бацька быў у той час праваслаўным духоўнікам. Падобныя акалічнасці ў біяграфіі былі, па сутнасці, несумяшчальнымі з працай на ніве савецкай бібліятэчнай справы. Таму, напэўна, Яўген Іванавіч падрыхтаваў і ў 1928 г. надрукаваў кнігу «Массовый читатель и антирелигиозная пропаганда» [20]. Калі не ўлічваць атэістычны ўхіл, выданне карыснае выкладам метадаў вывучэння чытацкіх інтарэсаў, прапановай прынцыпаў і прыёмаў уплыву на фарміраванне чытацкіх густаў. У 1930 г. Я. І. Хлябцэвіч перавёўся ў Народны камісарыят асветы РСФСР. Паглыблена займаўся навуковай дзейнасцю, даследаваў пытанні кіравання чытаннем, праблему «пісьменнік і чытач». У 1936 г. выйшла яго галоўная праца савецкага перыяду «Массовый читатель и работа с книгой». У дадзенай манаграфіі, як і ў іншых работах вучонага гэтай пары, на новым узроўні знайшла ўвасабленне асветніцкая традыцыя [4, с. 29]. Я. І. Хлябцэвіч па-ранейшаму клапаціўся аб забеспячэнні інфармацыйных і эстэтычных патрэбнасцей чалавека з народу – масавага чытача, які ў савецкую эпоху набыў для даследчыка дастаткова шырокі сацыяльны склад. Гэта і рабочы, калгаснік, чырвонаармеец. Найбольш грунтоўнымі аказаліся распрацоўкі ў дачыненні да салдацкага асяроддзя. Праходзячы тэрміновую службу, маладыя людзі павінны былі, паводле разваг Я. І. Хлябцэвіча, павысіць свой інтэлектуальны і духоўны ўзровень, стаць актыўнымі чытачамі, чаму заклікаліся спрыяць армейскія клубы, бібліятэкі, ленпакоі. З 1943 г. і да апошніх дзён свайго жыцця (памёр 20 кастрычніка 1953 г. у Маскве) Я. І. Хлябцэвіч быў выкладчыкам, вучоным сакратаром Маскоўскага бібліятэчнага інстытута. У 1947 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму: «М. Горький и Красная Армия (опыт изучения влияния произведений М. Горького на бойцов Красной Армии)» [2, с. 155]. У цэлым у працах савецкай пары Я. І. Хлябцэвіч адным з першых узняў пытанне аб выяўленні інтарэсаў чытачоў з мэтай дыферэнцыраванага кіравання іх чытаннем у сувязі з патрэбамі рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Пры вывучэнні гэтых інтарэсаў ён прымяняў комплекс метадаў (анкетаванне, чытацкія водгукі пра кнігі, аналіз бібліятэчнай дакументацыі), што мае месца і ў цяперашняй бібліятэчнай практыцы.

Яўген Іванавіч Хлябцэвіч увайшоў у гісторыю ў першую чаргу як бібліятэказнавец. Сваёй дзейнасцю ён спрыяў умацаванню пазіцый бібліятэчнай справы, развіццю бібліятэчнай тэорыі і практыкі. На ўласным прыкладзе паказаў, што сапраўдны бібліятэказнавец і бібліёграф павінен быць усебакова развітой асобай, разбірацца ў розных навуках, роднай і замежнай літаратуры, культуры. Ідэі Я. І. Хлябцэвіча пра даступнасць кнігі, ведаў і адукацыі не трацяць актуальнасці і на сучасным этапе развіцця бібліятэказнаўства, з'яўляюцца неабходнымі ў спасціжэнні гісторыі бібліятэчнай справы Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

1. *Варвашэвіч, М. А.* Хлябцэвіч Яўген / М. А. Варвашэвіч, Т. М. Махнач, В. У. Скалабан // Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўн. : у 6 т. –

Мінск : БелЭн, 1995. – Т. 6 / пад рэд. А. В. Мальдзіса ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. – С. 194–196.

2. *Леончиков, В. Е.* Е. И. Хлебцевич – видный советский библиотековед и библиограф / В. Е. Леончиков // Вопросы библиографоведения и библиотековедения : сб. науч. тр. / Минск. гос. пед. ин-т им. А. М. Горького. – Минск, 1976. – С. 150–157.

3. *Пажарыцкі, М. Б.* Янка Купала і бібліятэчная справа пачатку ХХ ст. / М. Б. Пажарыцкі // Рэсп. Купалаўскія чытанні : зб. навук. арт. / рэдкал.: І. В. Жук (адк. рэд.) [і інш.]. – Гродна : ГрДУ, 2013. – С. 73–77.

4. *Пожарицкий, М.* Роль Евгения Хлебцевича в создании бесплатных народных библиотек в Беларуси / М. Пожарицкий // Бібліятэчны свет. – 2009. – № 3 (51). – С. 28–29.

5. *Пожарицкий, М. Б.* Человек и эпоха: к 125-летию со дня рождения библиотековеда Евгения Хлебцевича / М. Б. Пожарицкий // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; рэдкал.: Р. С. Матульскі (гал. рэд.) [і інш.] ; склад.: Л. Г. Кірухіна, К. В. Суша. – Мінск, 2009. – Вып. 11. – С. 240–244.

6. *Покало, М. И.* История библиотечного дела в БССР / М. И. Покало. – Минск : Выш. шк., 1986. – С. 54–56.

7. *Пяткевіч, А.* Літаратурная Гродзеншчына: Мясціны. Людзі. Кнігі / А. Пяткевіч. – Мінск : [Бацькаўшчына], 1996. – С. 24.

8. *Пяткевіч, А.* Людзі культуры з Гродзеншчыны : давед. / А. Пяткевіч. – Гродна : [ГрДУ], 2000. – С. 309–310.

9. *Семашкевіч, Р.* Сябар Купалы / Р. Семашкевіч // Дзень паэзіі – 1973. – Мінск : Мастац. літ., 1973. – С. 173–176.

10. *Семашкевіч, Р. М.* Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе (канец XIX – пачатак XX ст.) / Р. М. Семашкевіч. – Мінск : Выд. БДУ, 1971. – С. 67–68.

11. *Скалабан, В.* Купала и Хлебцевич / В. Скалабан // Неман. – 1985. – № 3. – С. 140–144.

12. *Скалабан, В.* Паплечнік Цёткі і Янкі Купалы: да 100-годдзя з дня нараджэння Яўгена Хлябцэвіча / В. Скалабан // Літаратура і мастацтва. – 1984. – 24 жніўня. – № 34 (3236). – С. 13.

13. *Скалабан, В.* Хлябцэвіч Яўген Іванавіч / В. Скалабан // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 6, кн. 2 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 70.

14. *Скалабан, В. У.* Хлябцэвіч Іван Андрэевіч / В. У. Скалабан // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 17 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 33.

15. *Скалабан, В. У.* Хлябцэвіч Яўген Іванавіч / В. У. Скалабан // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 17 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 33–34.

16. *Хлебцевич, В.* Село Кленики – во время мировой войны / В. Хлебцевич [падрыхт. да друку В. Скалабан] // Bialoruskie Zeszyty Historyczne. – 1995. – № 2. – С. 132–145.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Хлебцевич, Е.* Возрождение белорусской народнической литературы / Е. Хлебцевич // Белорусский научно-литературный кружок студентов С.-Петербургского университета. – СПб. : Тип. Б. М. Вольфа, 1914. – С. 19–36.

*18. Хлебцевич, Е.* Развитие библиотечного дела в Белоруссии / Е. Хлебцевич // Труды Первого Всероссийского съезда по библиотечному делу, состоявшегося в С.-Петербурге с 1-го по 7-ое июня 1911 г. – СПб. : Тип. М. Меркушева, 1912. – С. 430–431.

*19. Хлебцевич, Е. И.* Библиотеки и кооперации / Е. И. Хлебцевич. – Ковна : Изд. кружка студентов, 1912. – 20 с.

*20. Хлебцевич, Е. И.* Массовый читатель и антирелигиозная пропаганда : опыт изучения читательских интересов и методы антирелигиозной пропаганды и руководства чтением / Е. И. Хлебцевич. – М. ; Л. : Гос. изд-во, 1928. – 181 с.

*21. Хлебцевич, Е. И.* Массовый читатель и работа с книгой / Е. И. Хлебцевич. – М. : Учпедгиз, 1936. – 208 с.

*22. Чыгрын, С. М.* Пакліканыя на родны парог : гісторыка-краязнаўчыя арт. / С. М. Чыгрын. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2005. – С. 25–29.

*M. PAZHARYTSKI*

**EVGENIY KHLEBTSEVICH'S CONTRIBUTION TO THE LIBRARIANSHIP OF BELARUS**

*Topical issues of the history of librarianship on the example of Evgeniy Khlebtsevich's library work are considered in the article. His pre-soviet scientific and practical library work is analyzed in detail for the first time. Particular attention is paid to the free public libraries, with the establishment of which Khlebtsevich was concerned along with the theoretical understanding of their peculiarities. It is noted that he made up a recommendation bibliography for them. It is stated that E. Khlebtsevich made a great contribution to the development of the library networks' conception. It is revealed that the elements of his pre-revolutionary methods connected with populism and enlightenment were realized also in his scientific works of the soviet period. A conclusion that Khlebtsevich's library ideas are of current importance nowadays is made.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 04.02.2014.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ